# ПРА ЧУЛАСЦЬ І ПАТРАБАВАЛЬНАСЦЬ КІРАЎНІКА


У. ЛАБАНОК

Першы сакратар Віцебскага абкома КПБ


Дырэктар Віцебскага завода заточных станкоў тав. Сабалеўскі не заседжваецца ў сваім кабінеце. Яго часта можна сустрэць у цэхах, брыгадах, на будаўнічай пляцоўцы. У задушэўных гутарках з рабочымі ён даведваецца аб іх думках і планах, аб іх патрабаваннях. У механічным цэху, напрыклад, рабочыя задалі яму многа пытанняў:

— Ці будзе цэх папаўняцца універсальным абсталяваннем?

— Калі будзе ўкаранёна ў вытворчасць рацыяналізатарская прапанова тав. Вінаградава?

— Як атрымаць пуцёўку на курорт?..

Дырэктар адказаў на ўсе пытанні. Тут жа ён даведаўся аб недахопах у рабоце цэха.

Трэба сказаць, што гутаркі дырэктара з рабочымі атрымліваюцца цікавымі, змястоўнымі. Тав. Сабалеўскі клапатліва развівае парасткі новага, падтрымлівае людзей, якія вышукваюць і ўкараняюць у вытворчасць усё новае, перадавое. Клапатлівым, уважлівым адносінам да людзей і разам з тым высокай патрабавальнасці да іх ён вучыць майстроў, брыгадзіраў, начальнікаў цэхаў.

Не стаяць на месцы, ісці ўперад, нястомна ўдасканальваць вытворчасць — вось галоўная задача, над вырашэннем якой працуе калектыў завода. Тут усё пастаўлена на службу сямігодцы.

...

...насць да іх. Вядома выключная клапатлівасць і ўважлівасць Уладзіміра Ільіча да людзей, але калі па чыёй-небудзь халатнасці цярпела агульная справа, — ён быў непрымірымы, суровы і бязлітасны. З выключнай увагай ён выслухоўваў субяседніка, ні ў малейшай ступені не даваў яму адчуць сваёй перавагі, ахвотна дзяліўся з таварышамі сваімі думкамі і поглядамі. Н. К. Крупская ў сваіх успамінах расказвае, што нават пры вырашэнні сваіх асабістых спраў Уладзімір Ільіч Ленін пытаў сябе: «Што скажуць аб гэтым рабочыя?»

Віцебскі абком і райкомы партыі імкнуцца выхоўваць кіруючыя кадры ў духу строгага захоўвання дзяржаўнай і партыйнай дысцыпліны, вучаць іх пастаянна клапаціцца аб людзях—стваральніках матэрыяльных даброт. І гэта дае станоўчыя вынікі ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве.

...

15,4 цэнтнера больш, чым летась. Надой на карову склаў 1.427 кілаграмаў—на 112 кілаграмаў больш леташняга.

Валавая вытворчасць мяса за гэты перыяд узрасла на 58 працэнтаў. На сто гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў атрымана па 13,5 цэнтнера—на 5 цэнтнераў больш мінулагодняга. Павялічылася вытворчасць малака і мяса ва ўсіх раёнах вобласці. Калгасы ж Расонскага, Віцебскага, Лёзненскага, Сенненскага, Суражскага, Езярышчанскага раёнаў у 1,8—2,5 раза атрымалі мяса больш, чым у мінулым годзе. 146 сельгасарцелей атрымалі на сто гектараў угоддзяў звыш 100 цэнтнераў малака.

Гаспадарчыя вынікі паказваюць, што там, дзе ўмела падабраны і расстаўлены кіруючыя калгасныя кадры, дзе партыйныя арганізацыі нястомна займаюцца выхаваннем людзей, падтрымліваюць усё новае, перадавое,—там няўхільна развіваецца грамадская гаспадарка, выконваюцца сацыялістычныя абавязацельствы.

Камуністы, усе нашы кадры працуюць дзеля народа. У нашай краіне ўсё робіцца


З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы